Управленне па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”
Грамадскае аб’яднанне “Беларускі фонд культуры”

# “ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

III АДКРЫТЫ КОНКУРС
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА
ВАКАЛЬНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

13 красавіка 2023 года

**Мінск**
**2023**

III адкрыты конкурс беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва“ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”: даведнік; склад.: В.Р. Лапурка, Н.У. Касцяневіч; пад рэд. Ю.С. Лабковіч [і інш]. – Мінск: ЦДАДіМ “Ветразь” г.Мінска, 2023. – с. 44.

Змест даведніка складаюць матэрыялы, якія даюць уяўленне пра сістэму далучэння дзяцей і моладзі краіны да традыцыйных народных спеваў і інструментальнай музыкі беларусаў.

У даведнік увайшлі прывітанні заснавальнікаў конкурсу, звесткі пра ўдзельнікаў, гасцей і арганізатараў.

Выданне ілюстравана фотаздымкамі.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца беларускай нацыянальнай культурай, яе гісторыяй і традыцыямі.

Аўтэнтычная назвы твораў не падвяргаліся рэдактарскай апрацоўцы.

Выданне ілюстравана фотаздымкамі.

# “ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

III адкрыты конкурс беларускага народнага
вакальна-інструментальнага выканальніцтва
**Кастрычніцкі раён г. Мінска**

Аўтар ідэі і канцэпцыі, навуковы кіраўнік праекта
Мікалай Козенка

Каардынатары праекта:
Алена Грыцэнка
Кацярына Сізова

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ І АРГАНІЗАТАРЫ**:

Упраўленне па адукацыі
адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”

Грамадскае аб’яднанне “Беларускі фонд культуры”

**Пры арганізацыйным удзеле**
дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №226 г.Мінска”

**Фінансавая падтрымка**
раённая арганізацыя г.Мінска
рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Белая Русь”

# І. ПРЫВІТАННІ
# ўдзельнікам і гасцям
III адкрытага конкурсу беларускага народнага
вакальна-інструментальнага выканальніцтва
**“ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”**

***Сардэчна вітаю арганізатараў, гасцей і ўдзельнікаў III адкрытага конкурсу вакальна-інструментальнага выканальніцтва***



Мастацкая культура Беларусі фарміравалася на працягу стагоддзяў. Стагоддзямі з пакалення ў пакаленне перадаваліся найбагацейшыя духоўныя каштоўнасці, якія праслаўляюць маральную сутнасць чалавека. У іх – высокія ідэалы дабра і справядлівасці.

На працягу ўсёй гісторыі нашу краіну праслаўлялі і працягваюць праслаўляць арыгінальныя архітэктурныя і мастацкія школы, непаўторныя творы музыкі і літаратуры.

Культура – вельмі шырокае і шматграннае паняцце. Можна казаць як пра культуру народа, так і пра культуру асобна ўзятага чалавека. Калі казаць пра беларускую культуру, то гэта культура беларускага народа. Я з упэўненасцю магу сказаць, што беларуская нацыянальная культура – гэта наш гонар. У раннім дзяцінстве, дзякуючы калыханцы, мы адкрываем хараство беларускай народнай песні. Затым адкрываем для сябе народныя традыцыі, якія прывіваюць любоў да мовы, а, пасталеўшы, знаёмімся з вялікімі творамі музыкі, жывапісу, літаратуры, архітэктуры. Гэта важна не толькі для кожнага асобна ўзятага чалавека, але і для жыцця ўсёй краіны ў цэлым. Так культура, перадаецца з пакалення ў пакаленне, і становіцца вечнай на ўсе часы.

Сучаснаму грамадству неабходна інтэлектуальна развітая асоба з яе ўнутраным светам, інтарэсамі, патрэбамі і творчымі магчымасцямі. І для нашай краіны становіцца надзвычай актуальнай задача выяўлення, развіцця і падтрымкі таленавітых і адораных дзяцей.

Адораныя, таленавітыя дзеці і моладзь – гэта патэнцыял любой краіны!

Бо творчы пачатак у чалавеку – гэта заўсёды імкненне наперад, да лепшага, да прагрэсу, да дасканаласці, а творчасць – гэта мэтанакіраваная дзейнасць чалавека, якая стварае новыя каштоўнасці, якія валодаюць грамадскім значэннем.

Конкурс вакальна-інструментальнага выканальніцтва «Згукі мінуўшчыны» дае магчымасць кожнаму ўдзельніку прэзентаваць свае ідэі, паказаць свае дасягненні і, вядома ж, атрымаць прафесійную ацэнку праведзенай работы.

Я думаю, што атрыманы станоўчы вопыт, набыты падчас удзелу ў дадзенным творчым конкурсе, дапаможа сфарміраваць у ўдзельнікаў ўпэўненасць у сабе і сваіх сілах, пазітыўнае стаўленне да сябе і да навакольнага свету, атрыманне новых уражанняў і пашырэнне прафесійнага кругагляду.
Дзякуй, што вы неабыякавыя да мастацтва і творчасці!

Жадаю ўсім арганізатарам, гасцям і ўдзельнікам конкурсу праўдзівага поспеху, не таго які дасягаецца мімалётна, а таго, які суправаджае ўпартых, руплівых і таленавітых.

Любіце сваю Радзіму, ганарыцеся яе мінулым, стварайце сучаснае і звязвайце з ей сваю будучыню!

**Юлія ЛАБКОВІЧ,**
дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
"Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
"Ветразь" г.Мінска".

***Шаноўныя сябры, паважаныя аматары***
***і прыхільнікі беларускага народнага мастацтва!***



Паважаныя сябры! Вось і прыйшло доўгачаканае традыцыйнае свята – трэці адкрыты конкурс беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны”!

Гэты конкурс дае нам усім магчымасць дакрануцца да непаўторнага народнага мастацтва, выявіць таленавітых выканаўцаў і педагогаў, адчуць самабытны каларыт і характар традыцыйнай музычнай культуры Беларусі.

Песенная і інструментальная творчасць народа заснавана на яго традыцыях, адлюстроўвае калектыўна выпрацаваныя эстэтычныя прынцыпы. Гэта абагульняючы і зберагаючы вопыт многіх пакаленняў, таму народная музыка мае вялікае эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Вось чаму адной з галоўных задач адкрытага конкурсу з’яўляецца падтрымка і выяўленне музычна адораных дзяцей, падлеткаў, развіццё іх творчага патэнцыялу.

Традыцыйная музычная культура – аснова нацыянальнага музычнага стылю, самадзейных музыкальных калектываў. Песенная творчасць беларусаў адметная разнастайнасцю і багаццем мясцовых традыцый. Інструментальная музыка беларусаў характарызуецца багаццем жанраў, што абумоўлена разнастайнасцю яе жыццёва-сацыяльных функцый. У народнай практыцы выкарыстоўваюць розныя тыпы музычных інструментаў. І конкурс “Згукі мінуўшчыны” дае ўнікальную магчымасць абмену творчымі дасягненнямі і дэманстрацыі перанятых мастацкіх уменняў у сацыякультурным побыце.

Вельмі добра, што сёння ёсць педагогі, выканаўцы, якія імкнуцца захаваць нацыянальныя традыцыі, папулярызуюць розныя стылі і кірунки, дэманструюць свету непаўторныя рысы беларускага мастацтва.

Хочацца пажадаць усім удзельнікам трэцяга адкрытага конкурсу беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” натхнення і поспехаў, выдатнага настрою, сапраўднага шчасця і радасці ад сустрэчы з музыкай!

**Алена БЫЧАНОК,**
начальнік упраўлення па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска

## *Шаноўныя сябры!*



Рады вітаць арганізатараў і ўдзельнікаў 3-га адкрытага конкурсу беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны”. Ужо сам факт яго арганізацыі ў Мінску заслугоўвае вельмі станоўчай ацэнкі, што пацвярджае зацікаўленасць народнай традыцыйнай культурай рознымі катэгорыямі насельніцтва вялікага ўрбанізаванага мегаполіса, дзе культура і мастацтва маюць вельмі разнастайны ландшафт. Гэты конкурс, як і іншыя адметныя мерапрыемствы па адраджэнні, шырокім укараненні ў сучасную сацыяльна-культурную практыку і папулярызацыі народных музычна-вакальных і танцавальных традыцый вельмі станоўча ўплываюць на абуджэнне нацыянальнай свядомасці і ідэнтычнасці беларусаў, фарміраванне самапавагі і гонару за сваю гісторыю і культуру.

Хачу нізка пакланіцца ініцыятарам і арганізатарам гэтага і іншых падобных конкурсаў і фестываляў за сапраўды падзвіжніцкую дзейнасць, плёнам якой сталі захаваныя і адроджаныя традыцыі і абрады, народная проза, песні і танцы, раней забытыя музычныя інструменты, рамёствы і строі, якія так узбагацілі культуру Беларусі, зрабілі яе адметнай і непаўторнай, цікавай для іншых краін і народаў.

Хачу выказаць шчырую ўдзячнасць і ўсім удзельнікам конкурсу, якія з радасцю і ўменнем чарговы раз прадэманструюць свае зацікаўленыя адносіны і любоў да народнага мастацтва, якое духоўна ўзбагачае і ўзвышае, становіцца важнай жыццёвай каштоўнасцю кожнага.

Шчыра жадаю ўдзельнікам конкурсу натхнення і новых адкрыццяў на творчым шляху!

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ,**
старшыня грамадскага аб’яднання
“Беларускі фонд культуры”

***Паважаныя ўдзельнікі і госці конкурсу, прыхільнікі традыцыйнай культуры!***



Трэці адкрыты конкурс “Згукі мінуўшчыны” сёння, фактычна, адзіны ў краіне сістэмны праект у дзяржаўным сектары, які захоўвае і транслюе ў часе помнікі традыцыйнай вакальна-інструментальнай спадчыны ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Розніца паміж: а) фальклорным выканальніцтвам (мастацтвам вуснай традыцыі), калі носьбіт фальклору, фактычна “агучвае” навакольны сусвет, уваходзіць у сугучча з “партытурай прыроды сваёй зямлі” і б) прафесійным выканальніцтвам (мастацтвам пісьмовай традыцыі), калі музыкам выконваецца аўтарская партытура дзеля задавальнення эстэтычных пачуццяў слухачоў і атрымання выканаўцам ганарару, – дэтальна прааналізавана ў кнігах заснавальніка кампаратыўнага мастацтвазнаўства Генрыха Арлова і стваральніка тэорыі кантанацыі акадэміка Ігара Мацієўскага. Дадзеная розніца (асабліва для самазахавання народа, з якога паходзяць фальклорныя выканаўцы) досыць вялікая. Пакуль жывы фальклор народу – жыве сам народ і яго дзяржава.

Праект “Згукі мінуўшчыны” за апошнія гады падоўжыў у краіне “фальклорную” рэвалюцыю, распачатую ў 1990-я гады фестывалямі “Чачэрская полька”, “Берагіня” і шэрагам іншых імпрэз, арыентаваных на аўтэнтычны фальклор Беларусі. Прызабытыя танцы, песні, інструментальныя найгрышы, народная проза нашых продкаў пераймаюцца вусным шляхам (так, як было спрадвеку) і матэрыялізуюцца пасярод Мінску і іншых цэнтраў урбанізму XXI стагоддзя. Нарматывы спаборніцтва пастаянна дасканаляцца праз перазацвярджэнне палажэння і канцэпцыі конкурсу. Рэпертуар, касцюмы, пластыка рухаў, манера спеваў, дыялект маўлення – вітаюцца толькі свае, з уласнай вёскі, гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну. Творы мусяць быць перанятыя метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі (“глядзі – вучыся – пераймай”). Настаўнік у такім выпадку – памочнік і дарадца, а не дыктатар і рэпетытар. Дадзеная методыка выхоўвае ў захопленым фальклорам чалавеке асобу, імправізатара, здольнага да прыняцця самастойных рашэнняў і актыўнай жыццёвай пазіцыі. А мастацкі ўзровень і ўзрост выканаўцаў (у конкурсе бяруць удзел асобы ва ўзросце ад 4 да 31 гадоў) звычайна надае ўсяму, што адбываецца на пляцоўках “Згукаў мінуўшчыны”, непаўторны і аптымістычны (за лёс народу, краіны, чалавецтва) каларыт.

**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ**,
дацэнт, кандыдат культуралогіі, старшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны НАН Беларусі, *старшыня рады экспертаў*

# II. ПРАГРАМА КОНКУРСУ

**13 красавіка 2023 года**
**ДУА “Сярэдняя школа № 226 г.Мінска”**

| **Час правядзення** | **Змест праграмы** | **Месца правядзення** |
|---|---|---|
| **12:30** | Рэгістрацыя ўдзельнікаў конкурсу | Фае |
| **13:00-14:35** | Адкрыццё конкурсу<br>**І аддзяленне**<br>**Праект “Спеўнае выканальніцтва”**<br>*Выступ*<br>І - ІV узроставыя групы | Актавая зала |
| **14:35-14:50** | **Прэзентацыя фальклорнага тэатра “Скарбніца”**<br>*ДУА “Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт”* | Актавая зала |
| **14:50-15:00** | Цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў праекта “Спеўнае выканальніцтва” | Актавая зала |
| **15:00-16:00** | **ІІ аддзяленне**<br>**Праект**<br>**“Музычна-інструментальнае выканальніцтва”**<br>**Намінацыя “**Ансамблевае выканальніцтва”<br>І - ІІ узроставыя групы<br>**Намінацыя** “Сольнае выканальніцтва”<br>І - ІІ узроставыя групы | Актавая зала |
| **16:10-16:25** | Абедзены перапынак | |
| **16:25-16:35** | Цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў праекта:<br>“Музычна-інструментальнае выканальніцтва” | Актавая зала |
| **16:35-17:40** | **ІІІ аддзяленне**<br>**Праект “Турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў народнай спадчыны”**<br>І - ІІІ узроставыя групы | Актавая зала |
| **17:40-17:50** | Прэзентацыя фальклорнага калектыву<br>**“Скарбніца традыцый”**<br>*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”* | |
| **17:50-18:00** | Цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў праекта “Турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў народнай спадчыны” | Актавая зала |

**III. АРГАНІЗАТАРЫ. ТВОРЧЫЯ ГРУПЫ**
III адкрытага конкурсу беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва
“ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

## РАДА ЭКСПЕРТАЎ



***КАЛАЦЭЙ Вячаслаў Віктаравіч***
дацэнт, кандыдат культуралогіі, старшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны НАН Беларусі, *старшыня*



***БОГАНЕВА Алена Міхайлаўна***
загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору дзяржаўнай навуковай установы “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, 2014 года



***ПЛАДУНОВА Таццяна Аляксандраўна***
дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”



***КРЫЎКО Таццяна Міхайлаўна***
магістр мастацтваў, метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі аддзела навукова-метадычнага і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дадатковай адукацыі установы адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь



***ГУМІНСКАЯ Алена Васільеўна,***
вядучы спецыяліст аддзела інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ

БЫЧАНОК
Алена Аляксандраўна



начальнік упраўлення па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска

ІЛЬІНСКАЯ
Алена Пятроўна



загадчык сектарам выхаваўчай, ідэалагічнай работы і аховы дзяцінства ўпраўлення па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска

ЛАБКОВІЧ
Юлія Сяргееўна



дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”

СТРУЖЭЦКІ
Тадэуш Іванавіч



старшыня грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд культуры”

КОЗЕНКА
Мікалай Аляксеевіч



аўтар праекта “Адкрыты конкурс беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны”

КРУПЕЙЧАНКА
Максім Андрэевіч



старшыня раённай арганізацыі г.Мінска рэспубліканскага грамадскага аб'яднання “Белая Русь”

# ДЫРЭКЦЫЯ

ГРЫЦЭНКА
Алена Іванаўна



наменнік дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”, *дырэктар конкурсу*

СІЗОВА
Кацярына
Чаславаўна



наменнік дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”

КАСЦЯНЕВІЧ
Надзея
Уладзіміраўна



загадчык аддзяленнем народнай творчасці “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”

ЛЯВОНЧЫК
Алена Мікалаеўна



загадчык вучэбна-метадычным кабінетам дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”

ЗАХАРЭВІЧ
Ала Паўлаўна



загадчык аддзяленнем дэкаратыўна-прыкладной творчасці і выяўленчага мастацтва дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”

ПШАНІЧНАЯ
Наталля Іванаўна



дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №226 г.Мінска”

# РЭЖЫСЁРСКА-ПАСТАНОВАЧНАЯ ГРУПА

| | |
|---|---|
| Рэжысёр-пастаноўшчык: | Надзея Касцяневіч |
| Памочнікі рэжысёра: | Таццяна Ярмашук<br>Вольга Кульбіцкая<br>Мацвей Лішын<br>Іван Нехай |
| Сцэнарыст: | Вольга Кульбіцкая |
| Мастакі-афарміцелі: | Вольга Крэменеўская<br>Юлія Грыб |
| Гукарэжысёр: | Уладзіслаў Цітоў |
| Сакратарыят: | Кацярына Фядотава<br>Святлана Чамецьева<br>Вольга Крэменеўская<br>Юлія Грыб |
| Вядучыя-дыктары: | Вольга Кульбіцкая<br>Мацвей Лішын |
| Рэкламна-інфармацыйнае суправаджэнне конкурсу: | Яніна Храмцова-Басая<br>Вікторыя Лапурка |
| Фотасуправаджэнне, макеты дыпломаў, падзячных лістоў: | Яніна Храмцова-Басая |
| Куратары дэлегацый: | Надзея Касцяневіч<br>Наталля Шамецька |

# IV. УДЗЕЛЬНІКІ
III адкрытага конкурсу беларускага народнага
вакальна-інструментальнага выканальніцтва
“ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

## I ПРАЕКТ
## “СПЕЎНАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА”

### I узроставая група
*(4-6 год)*

**Вакальны ансамбль “Васількі”**
*ДУА “Яслі-сад №431 г. Мінска”*

Ансамбль “Васількі” дзейнічае з 2018 года. Прымае ўдзел у забавах, святах сада, бацькоўскіх сходах. Удзельнічаў у конкурсах “Згукі мінуўшчыны”. Калектыў мае Дыплом II ступені за ўдзел у другім конкурсе “Згукі мінуушчыны” (2020г.).

*Кіраўнік* - Сідлярэвіч Эла Васільеўна

**Праграма выступлення**

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

1. Беларуская дзіцячая забава *“Мядзведзь”*
2. Беларуская гульня *“Верабей”*
3. Песня *“Беларусь - мая зямля”* (словы і музыка А.Сцянько)



*Выконваюць:*

1. Данік Ваня
2. Шыманская Маша
3. Стрыгіна Паліна
4. Малярэвіч Саша
5. Жарнасек Мацвей
6. Караблёў-Карбоўскі Роберт
7. Хаменка Эвеліна
8. Кулеш Жэня
9. Адамовіч Жэня
10. Паддубоцкая Сафія

# II узроставая група
*(7-11 год)*

**Фальклорны калектыў “Мілавіца”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*



Фальклорны калектыў “Мілавіца” заснаваны ў 1990 годзе таленавітай асобай - Марыяй Снітко. Сёння на калектыве працуе Надзея Уладзіміраўна Касцяневіч разам з акампаніятарам Булойчыкам Алесям Пятровічам, этнахарэографам Козенкам Мікалаем Аляксеевічам, педагогамі Кульбіцкай Вольгай Аляксандраўнай і Герашчанкай Алесяй Аляксандраўнай. Рэпертуар калектыва - аўтэнтычныя матэрыялы рэгіёнаў Беларусі: песні, танцы, інструментальная музыка, гульні. Удзельнікі калектыву вывучаюць і прапагандуюць абрады, традыцыйныя святы беларусаў. Калектыў штогод бярэ ўдзел у рэспубліканскіх святах “Каляды”, “Масленіца”, “Гуканне вясны”, “Купалле” і з'яўляецца прызерам, дыпламантам, лаўрэатам шматлікіх гарадскіх, рэспубліканскіх, міжнародных фестываляў і конкурсаў.

*Кіраўнік* – Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна;
*педагог* – Кульбіцкая Вольга Аляксандраўна

**Праграма выступлення**

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

1. Веснавая песня “Плача, плача, салавейку”. Вёска Закальное, Любанскі раён, Мінская вобласць.
2. Жартоўная песня *“Кацілася чорна галка”*. Запіс Рыгора Шырмы, 1934 г., вёска Ярэмічы, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.

*Выконваюць:*

1. Саўлка Дзяніс
2. Маскалёва Дар’я
3. Трэццякова Кацярына
4. Трэццякоў Кастусь
5. Славінская Кіра
6. Шаравар Станіслаў
7. Мазоль Роберт
8. Вайтовіч Вікторыя

## Фальклорны гурт “Вясейка”

*ДУА “Вясейская дзіцячая школа мастацтваў Слуцкага раёна”*



Дзіцячы фальклорны калектыў “Вясейка” быў заснаваны ў 2000 годзе. Ідэя ўзнікнення калектыву належала кіраўніку - Ніне Пятроўне Макоўскай. Яе вабілі прыгожыя песні і танцы, якія выконваліся ў гэтым цудоўным кутку нашай Радзімы. А працавітыя, шчырыя і добразычлівыя людзі сталага ўзросту аж маладзелі і прыгажэлі, калі ішлі па кругу з вясёлай, заліхвацкай “казой”.

Калектыў налічвае 25 чалавек, з іх 15 чалавек ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў.

Вялікая ўвага ўдзяляецца правядзенню народных святаў: “Зажынкі”, “Дажынкі”, “Каляды”, “Гуканне вясны”, “Масленіца”, “Юр’е”, “Купалле” і іншыя.

*Кіраўнік* **-** Макоўская Ніна Пятроўна

### Праграма выступлення

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

1. Фальклорная замалёўка *“Акуліна”*

*Выконваюць:*

1. Беразоўская Іна 5. Лукашэня Арына
2. Бабінская Мілана 6. Масюк Сафія
3. Богдан Лізавета 7. Шыбаловіч Данііл
4. Гудлеўская Ксенія 8. Гушчэня Дар’я

## Фальклорны ансамбль “Млынок”

*ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска”*

Творчасць фальклорнага ансамбля “Млынок” Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г. Мінска пад кіраўніцтвам Мардань Дар`і Анатольеўны накіравана на вывучэнне беларускага музычнага фальклору народнага календара.

У рамках праграмы ансамбля “Млынок” распрацаваны да раздзела “Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў” відэаагляд “Як гучыць Любаншчына”, з мэтай азнаямлення навучэнцаў з абрадам “Провады русалкі” і манерай выканання аўтэнтычных песень Любанскага рэгіёну, які заняў першае месца ў гарадскім конкурсе “Образовательная цифра 2022”.

*Кіраўнік* - Мардань Дар’я Анатольеўна

### Праграма выступлення

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

1. *“Вясна на калочку”.*
2. *“Жавароначкі прыляціце”.* Запісана ў 1980 годзе ў вёсцы Бывалькі Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці ад Савік Марфы Цімафееўны (1923 г.н.).

*Выконваюць:*
1. Багрыцэвіч Аляксандра
2. Беразнева Ксенія
3. Кузняцова Ульяна
4. Раманава Аляксандра
5. Сурынт Уладзіслаў



## III узроставая група

*(12-17 год)*

**Фальклорны калектыў “Мілавіца”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

*Кіраўнік* – Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна,
*педагог* – Кульбіцкая Вольга Аляксандраўна

**Праграма выступлення**

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

1. Веснавая песня *“Вол бушуе, вясну чуе”.* Вёска Шапчыцы, Старадарожскі раён.
2. Веснавы карагод *“А па возеру, а па сіняму”.* Вёска Язбы, Крупскі раён.

*Выконваюць:*
1. Казакова Зоя
2. Юшкевіч Паліна
3. Маскалёў Дзяніс
4. Барадзін Юрась
5. Сілюк Алёна
6. Пенязь Надзея
7. Мядзьвецкі Ігар



*Намінацыя “Ансамблевыя спевы” (хлопцы)*

1. Пазаабрадавая песня *“Ой, там на ганку”* (Мінская вобласць).
2. Валачобная песня *“Сядзіць роза, расцвітае”* (Паазер’е).

*Выконваюць:*
1. Маскалёў Дзяніс
2. Мядзьвецкі Ігар
3. Барадзін Юрась

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы” (дзяўчаты)*

1. Веснавая песня “*Прыйшла вясна, прыйшла красна*”. Вёска Палічын, Любанскі раён, Мінская вобласць.
2. Веснавая песня *“Вясна-красна наставала”* (Гомельскае Падняпроўе).

*Выконваюць:*
1. Пенязь Надзея
2. Казакова Зоя
3. Юшкевіч Паліна
4. Сілюк Алёна

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**узорны фальклорны гурт "Берагіня"**
*ДУА "Мётчанская сярэдняя школа Барысаўскага раёна"*

Гурт створаны ў 1996 годзе. Удзельнікамі калектыву з'яўляюцца 26 школьнікаў рознага ўзросту. Заснавальнікі гурту – Мікалай Аляксеевіч Козенка (кіраўнік, уладальнік медаля Францыска Скарыны) і Антаніна Анатольеўна Абрамовіч (музычны кіраўнік, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, народны музыка).



Дзейнасць гурта скіравана на ўсебаковае выхаванне вясковых дзяцей сродкамі розных праяў традыцыйнага мастацтва (танец, карагод, песня, гульня, інструментальная музыка, народная проза) рэгіёну Цэнтральнай Беларусі, пераважна Мядоцкага краю, і грунтуецца на прынцыпах выяўлення, вывучэння, пераймання, папулярызацыі і распаўсюджання аўтэнтычнага фальклору Бацькаўшчыны.

Гурт "Берагіня" ўганараваны Дыпломам ЮНЕСКА "За значны ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі".

*Музычны кіраўнік* - Антаніна Анатольеўна Абрамовіч

**Праграма выступлення**

*Намінацыя "Ансамблевыя спевы"* (*дзяўчаты*)

1. Радзінная песня *"А было ў бабкі а чатыры бычкі"*. Запісана ў 2004 годзе ў вёсцы Ярцаўка Барысаўскага раёна ад Лідзіі Сямёнаўны Слесаронак (1918 г.н.).

*Выконваюць:*

1. Бабіцкая Карына
2. Бабіцкая Аліна
3. Галуза Ксенія
4. Гесць Дар'я
5. Сойка Настасся
6. Чарнуха Крысціна
7. Васкабойнік Ксенія

*Намінацыя "Ансамблевыя спевы"* (*хлопцы*)

2. Кірмашовая песня *"Раса землю крапіла".* Перанята ад групы "Дразды".

*Выконваюць:*

1. Кавальчук Аляксей
2. Гузан Іван
3. Міхайлаў Максім
4. Касцюковіч Мікіта
5. Кудзін Кірыл

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы мяшаным складам”*

3. Пазаабрадавая песня *“Із-за лесу, лесу цёмнага”*. Запісана ў 1998 годзе ў вёсцы Селішча Барысаўскага раёна ад Аўгінні Іванаўны Грук (1914 г.н.).

*Выконваюць:*

1. Касцюкевіч Мікіта
2. Кавальчук Аляксей
3. Міхайлаў Максім
4. Бабіцкая Аліна
5. Гузан Іван
6. Кудзін Кірыл
7. Бабіцкая Карына

## Фальклорны ансамбль “Явар”

*ДУА "Сярэдняя школа №159 г.Мінска"*

Фальклорны ансамбль ”Явар” утвораны на базе ДУА ”Сярэдняя школа №159 г.Мінска” у 2014 годзе, кіраўніком якога з’яўляецца Балцэвіч Святлана Генадзьеўна. Удзельнікі ансамбля, незалежна ад наяўнасці добрага голасу, слыху, адчування рытму, займаюцца з самага маленькага ўзросту. Рэпертуар, які складаецца з каляндарна-абрадавых песень, гульняў і забаўлянак, вывучаюць навучэнцы з голасу, карыстачыся аўдыа- і відэазапісамі традыцыйных носьбітаў фальклору.



“Явар” заўсёды жаданы госць на школьных і моладзевых імпрэзах, раённых і гарадскіх святах, часта бярэ ўдзел у фальклорных фестывалях і конкурсах нашай краіны і таксама па-за яе межамі.

*Кіраўнік* - Балцэвіч Святлана Генадзьеўна

### Праграма выступлення

*Намінацыя “Ансамблевыя спевы” (дзяўчаты)*

1. *“Вясняначка”.*
2. *“Вясна-красна”.*

*Выконваюць:*

1. Абрамчык Настасся
2. Краўчанка Марыя
3. Ціхановіч Лізавета
4. Катлярэнка Аляксандра
5. Урбан Мілена
6. Яцкевіч Альбіна
7. Халанькова Ганна

## IV  узроставая група
*(18-31 год)*

### Фальклорны калектыў “Верасень”
*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

У калектыве “Верасень” развіваюць пачуццё рытму, навучаюць гульне на музычных інструментах, прымаюць удзел у розных мерапрыемстах.

*Кіраўнік* – Кандрашова Алена Вітальеўна

**Праграма выступлення**

1. *“Вол бушуе, вэсну чуе”.* Запісана ў вёсцы Казлы, Ельскі раён, Гомельская вобласць.
2. *“Там на гары цыгане стаялі”.* Запісана ад гурта “Міжрэчча” вёскі Пагост, Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

*Выконваюць:*

1. Замарока Ксенія
2. Чучвал Кірыл
3. Пажога Анастасія
4. Мацяйковіч Яна
5. Хавкіна Марыя



# II Праект
# “МУЗЫЧНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА”

## I група

*(навучэнцы ўстаноў адукацыі і культуры)*

**Інструментальная група фальклорнага калектыву “Мілавіца”,**
*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

Інструментальная група фальклорнага калектыву “Мілавіца” вядзе актыўную канцэртную і конкурсную дзейнасць. Удзельнікі адзначаны дыпломамі 1-й, 2-й і 3-й ступені Першага і Другога адкрытага конкурсу народнага спеўнага і музычна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” (2018г., 2020г.). Прымалі ўдзел у: IV адкрытым конкурсе выканаўцаў беларускіх народных танцаў “Ветразь” (2018г.), X Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва “БЕРАГІНЯ 2018” (г.п. Акцябрскі, Гомельскай вобласці, 2018г.). У ансамблі вывучаюць такія народныя музычныя інструменты, як: баян, гармонік, цымбалы, дудачка, скрыпка, басэтля і разнастайныя ўдарныя інструменты (бубен, кляшчоткі, талеркі, вугольнік, рагула, біла, званок, барабан і іншыя).

*Кіраўнік* калектыву– Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна;
*кіраўнік інструментальнай групы* – Герашчанка Алеся Аляксандраўна

**Праграма выступлення**

*Намінацыя “Ансамблевае выканальніцтва”*

*Найгрышы:*
1. *Вальс “Местачковы”*. Беларускі народны танец. Запісаны ў Гомельскай вобласці.
2. *Полька “Бабачка”*. Беларускі народны танец.

*Выконваюць:*
1. Несцяронак Арсеній – гармонік
2. Маскалёва Дар’я – гармонік
3. Блахіна Вікторыя – гармонік
4. Пенязь Надзея – цымбалы
5. Трэццякоў Канстанцін - бубен



*Намінацыя “Траіста музыка”*

1. Найгрыш *“Кадрыля”.* Запісаны ў Магілеўскай вобласці.
2. Найгрыш *“Ва саду лі”, “Картузэ”.*
3. Найгрыш *“Юрачка”.* Запісаны ў 1976 годзе ў вёсцы Варонічы Полацкага раёна Віцебскай вобласці ад М.В. Дземяшкевіча (1910 г.н.).

*Выконваюць:*
1. Несцяронак Арсеній – гармонік
2. Пенязь Надзея – цымбалы
3. Маскалёва Дар’я – бубен

**Ансамбль народных інструментаў “Музыкі”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

У ансамблі вывучаюць тэорыю музыкі і народныя музычныя інструменты: баян, гармонік, цымбалы, дудачка, скрыпка, басэтля і разнастайныя ўдарныя інструменты (бубен, кляшчоткі, талеркі, вугольнік, рагула, біла, званок, барабан і іншыя). Актыўная творчая дзейнасць ансамбля адлюстроўваецца ў большасці канцэртных мерапрыемстваў цэнтра і конкурсах народнай інструментальнай музыкі.

Удзельнікі ансамбля прымалі ўдзел у Другім адкрытым конкурсе народнага спеўнага і музычна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” (2020 г.), атрымалі дыплом III ступені. Таксама лаўрэаты II ступені раённага этапа Рэспубліканскага смотра-конкурсу “Здравствуй, мир!” (2021 г., 2023 г.).

*Кіраўнік* – Герашчанка Алеся Аляксандраўна

**Праграма выступлення**

*Намінацыя “Ансамблевае выканальніцтва”*

1. Вальс *“Восень”.* Найгрыш запісаны ў Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці.
2. *“Аношкаўская скакуха”.* Беларускі народны танец. Запісаны ў весцы Аношкі Смалявічскага раёна Мінскай вобласці.

*Выконваюць:*



1. Лебедзеў Георгій - гармонік
2. Клюйко Сафія - гармонік
3. Тамашэвіч Сусана - цымбалы
4. Голуб Варвара - цымбалы
5. Сцепаненка Піліп - скрыпка
6. Бондараў Цімур - бубен
7. Герашчанка Алеся Аляксандраўна - гармонік

*Намінацыя “Траіста музыка”*

1. Вальс *“Ластаўка”.* Найгрыш запісаны ў 1972 годзе ў вёсцы Валынцы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
2. Найгрыш *“Кадрыля”.* Запісаны ў 1982 годзе ў вёсцы Карчаватка Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ад М.С. Глушаня (1924 г.н.).
3. Песенныя найгрышы *“Камарык”, “Дударочку”.*

*Выконваюць:*

1. Лебедзеў Георгій - баян
2. Сцепаненка Піліп - скрыпка
3. Бондараў Цімур - кляшчоткі, рагула, бубен

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**узорны фальклорны гурт "Берагіня"**
*ДУА "Мётчанская сярэдняя школа Барысаўскага раёна"*

Гурт "Берагіня" ўганараваны Дыпломам ЮНЕСКА "За значны ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі".

*Музычны кіраўнік* – Антаніна Анатольеўна Абрамовіч

**Праграма выступлення:**
*Намінацыя "Ансамблевае выканальніцтва"*

Найгрышы:
1. *"Полька"*
2. *"Вальс"*
3. *"Барыня".*



Творы пераняты з аўдыязапісаў фальклорных вандровак М.А. Козенкі ў вёсках Замужанне, Аздзяцічы, Аскеркі (2002-2021гг). Аранжыроўка - А.А. Абрамовіч.

*Выконваюць:*
1. Кавальчук Аляксей
2. Гузан Іван
4. Кудзін Кірыл
5. Міхайлаў Максім

**Фальклорны ансамбль "Явар"**
*ДУА "Сярэдняя школа №159 г.Мінска"*

Фальклорны ансамбль "Явар" утвораны на базе ДУА "Сярэдняя школа №159 г.Мінска" ў 2014 годзе, з 2018 года склаўся інструментальны састаў з удзельнікаў ансамбля, дзе па слыху падбіраюць песенныя і танцавальныя найгрышы. "Явар" заўсёды жаданы госць на школьных і моладзевых імпрэзах, раённых і гарадскіх святах, часта бярэ ўдзел у фальклорных фестывалях і конкурсах нашай краіны і таксама па-за яе межамі.

*Кіраўнік* – Балцэвіч Святлана Генадзьеўна;
*педагог* - Кізін Сяргей Міхайлавіч

**Праграма выступлення:**
*Намінацыя "Ансамблевае выканальніцтва"*

1. Танец *"Гірша-Мойша"* (Жыдок). Мястэчка Ільля Вялейскага раёна.
2. Танец *"Сербіянка".* Вёска Неглюбка, Гомельская вобласць.
3. *"Вясельны марш".*



*Выконваюць:*
1. Балцэвіч Антон - скрыпка
2. Успенскі Светаслаў - бубен, барабан
3. Таран Ціхан - кларнэт
4. Кізін Сяргей Міхайлавіч - гармонік

**Ансамбль народных інструментаў “Гарэзы”**

*ДУА "Сярэдняя школа № 159 г.Мінска"*

Ансамбль гарманістаў “Гарэзы” арганізаваны ў 2021 годзе, кіраўніком якога з’яўляецца Кізін Сяргей Міхайлавіч. Рэпертуар складаюць песенныя і танцавальныя найгрышы. За невялічкі час існавання “Гарэзы” прынялі ўдзел у школьных і пазашкольных мерапрыемствах.

*Кіраўнік* – Кізін Сяргей Міхайлавіч

**Праграма выступлення:**

*Намінацыя “Ансамблевае выканальніцтва”*

1. Танец *“Грыца”.* Ельскі раён, Гомельскай вобласці.
2. Танец *“Мальвіна”.* Вёска Бабічы, Чачэрскага раёна.



*Выконваюць:*

1. Клешчык Мірон - гармонік
2. Ляцко Міхаіл - барабан
3. Копран Арцём - гармонік
4. Кізін Сяргей Міхайлавіч - гармонік

# III Праект
# “ТУРНІР САЛІСТАЎ-МУЛЬТЫВЫКАНАЎЦАЎ ТВОРАЎ НАРОДНАЙ СПАДЧЫНЫ”

## I група

*(10–13 год)*

**Фальклорны гурт “Скарбніца традыцый”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*



**Палюшкевіч Варвара**

За 2022 год узнагароджана за творчыя поспехі і актыўны ўдзел у жыцці ЦДАДіМ "Ветразь"; удзельніца VI адкрытага конкурсу беларускіх народных танцаў "Ветразь-2022”. Мае серыю сертыфікатаў установы адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі". Навучаецца ў музычнай школе.

*Педагог* - Хамутова Ірына Вітальеўна

**Праграма выступлення**

1. Масленічная песня *“А сёння ў нас Масленка”.* Запісана ў 1985 годзе у вёсцы Смальяны Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ад Жулінок Ганны Фядотаўны, (1904 г.н.).
2. Народная казка *“Два маразы”.* Перанята з друкаванай крыніцы: Роднае слова: другая пасля лемантара кніга да чытання / пад рэд. С. Некрашэвіча. – Выд. 3-е. – Мінск : Савец. Беларусь, 1924. – 161 с.
3. Найгрыш на акардэоне “*Прыпеўкі”.* Запісан у 2019 годзе, аграгарадок Хацíслаў Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці ад Хомік Галіны Іванаўны (1952 г.н.).

**Фальклорны калектыў “Мілавіца”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

**1. Трэццякоў Кастусь**

Кастусь з 7 гадоў займаецца ў фальклорным калектыве “Мілавіца”, акрамя спеваў вучыцца іграць на цымбалах, ходзіць на харэаграфію. Таксама ў вольны час ад вучобы займаецца ў школе лыжамі і авіямадэляваннем.




*Педагог* - Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна

**Праграма выступлення**

1. Вялікодная песня *“А ў ляску, ляску на жоўтым пяску”.* Вёска Грыцкавічы, Крупскі раён.
2. Паданне *“Векавечная мяжа”.* Крыніца: “Бяздоннае багацце: легенды, паданні” (1990 г.).
3. Найгрыш *“Полька”.*

**2. Пенязь Надзея**

Надзея Пенязь пачала займацца ў калектыве "Мілавіца" ў 2019 годзе. Праявіла сябе як адказная і творчая асоба, якая акрамя спеваў і музыкі, займаецца маляваннем і лепкай.

*Педагогі* - Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна (народная проза);
Кульбіцкая Вольга Аляксандраўна (народная песня);
Герашчанка Алеся Аляксандраўна (найгрыш).



**Праграма выступлення**

1. Веснавая песня *"Вісна дзе бувала?".* Клічаўскі раён.
2. Казка пра жывёльны свет *"Стары воўк".* Крыніца: "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў (Цэнтральная Беларусь)".
3. Найгрыш беларускага народнага танца *"Крыжачок"* .

**ДУА "Дзіцячая школа мастацтва Асіповіцкага раёна" Магілёўскай вобласці**

**1. Смоляр Варвара**

Фальклорам пачала займацца ў верасні 2020 года. Актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах города і раёна.

*Педагог* - Еўдакімовіч Наталля Анатольеўна

**Праграма выступлення**



1. Беларуская народная песня *"Сястра сястру звала".* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).
2. Казка *"Якою мераю мераў".* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).
3. Мясцовыя прыпеўкі са скокамі. Запісана ў вёсцы Забалацце Магілёўскай вобласці Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).

**2. Шытава Марыя**

Фальклорам пачала займацца ў верасні 2022 года. Актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах города і раёна.

*Педагог* - Еўдакімовіч Наталля Анатольеўна

**Праграма выступлення**



1. Купальская песня *"Шла Купалка па вуліцы".* Запісана ў в.Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).
2. Казка *"Курачка Раба".* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).
3. Мясцовыя прыпеўкі са скокамі *"Пад язык".* Запісана ў вёсцы Забалацце Магілёўскай вобласці Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.)

## II група

*(14–17 год)*

### Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ўзорны фальклорны гурт “Берагіня”

*ДУА “Мётчанская сярэдняя школа Барысаўскага раёна”*

### 1. Кавальчук Аляксей




Аляксей займаецца ў фальклорным гурце “Берагіня” з 2015 года. Акрамя гэтага цікавіцца валейболам, іграй на музычных інструментах, камп'ютарным праграмаваннем.

*Педагог* - Абрамовіч Антаніна Анатольеўна

**Праграма выступлення**

1. Паставая песня (піліпаўка) *“Гэй, у горадзе”.*
Запісана ад Аўгінні Іванаўны Грук (1914 г.н.), вёска Селішча Барысаўскага раёна.
2. Казка *“Дудар”.* З запісаў Вацлава Ластоўскага.
3. Найгрыш “*Сербіянка”* (гармонік, бубен).
Пераняты ад Паўла Еўсцігнеевіча Міцькіна (1941 г.н.), вёска Старая Мётча.

### 2. Кудзін Кірыл



Кірыл займаецца ў фальклорным гурце “Берагіня” з 2015 года. Цікавіцца чытаннем мастацкай літаратуры, іграй на музычных інструментах, валейболам.

*Педагог* - Абрамовіч Антаніна Анатольеўна

**Праграма выступлення**

1. Казка “*Чые гады чалавек жыве”.* З кнігі “Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць” (1995 г.).
2. Паставая песня *“Служылі две братачкі”.* Запісана ад Зінаіды Дзмітраўны Колбік (1932 г.н.), вёска Новая Мётча Барысаўскага раёна.
3. Найгрыш *”Яблычка”* (гармонік). Пераняты ад Тамары Уладзіміраўны Захаравай (1954 г.н.), вёска Старая Мётча Барысаўскага раёна.

### 3. Чарнуха Крысціна



Крысціна займаецца ў фальклорным гурце “Берагіня” з 2020 года. Акрамя гэтага цікавіцца вышыўкай, іграй на музычных інструментах, спевамі.

*Педагог* - Абрамовіч Антаніна Анатольеўна

1. Найгрыш *“А на гарэ зайчыкі трубяць”* (дудка). Пераняты ад Алены Пятроўны Бельцюговай (1973 г.н.), горад Барысаў.
2. Купальская песня *“Купала на Йвана”.* Запісана ў 2002 годзе ад Аўгінні Іванаўны Грук (1914 г.н.), вёска Селішча Барысаўскага раёна.

**4. Галуза Ксенія**



Ксенія займаецца ў фальклорным гурце “Берагіня” з 2020 года. Акрамя гэтага цікавіцца ігрой на музычных інструментах, народнай прозай, чытаннем мастацкай літаратуры.

*Педагог* - Абрамовіч Антаніна Анатольеўна

**Праграма выступлення**

1. Найгрыш “*Я цяцерку пасу*” (дудка). Пераняты ад Тамары Уладзіміраўны Захаравай (1954 г.н.), вёска Старая Мётча Барысаўскага раёна.
2. Жніўная песня (спасаўка) *“А ў заіньки а тры тропанькі”.* Запісана ад Аўгінні Іванаўны Грук (1914 г.н.), вёска Селішча Барысаўскага раёна.
3. Казка *“Пра курачку рабу”.* З запісаў Ніла Гілевіча.

**Дзіцячы ўзорны ансамбль “Лянок”**

*ДУА “Дзіцячая школа мастацтваў Асіповіцкага раёна” Магілеўскай вобласці*

**1. Палякова Кацярына**



*Педагог* - Шведава Яўгенія Анатольеўна

**Праграма выступлення**

1. Веснавая песня *“На Тройцу дзеўкі вянкі вілі”.* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіч Лідзіі Трафімаўны (1931 г.н.).
2. Казка *“Вол”.* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіча Віктара Рыгоравіча (1930 г.н.).
3. “*Пратасевіцкія прыпеўкі”.* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіча Віктара Рыгоравіча (1930 г.н.).

**2. Скварцова Наталля**



*Педагог* - Шведава Яўгенія Анатольеўна

**Праграма выступлення**

1. Народная песня *“Няхай будзе пагодачка”*. Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіча Віктара Рыгоравіча (1930 г.н.).
2. Казка *“Баран бок абадран”.* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіча Віктара Рыгоравіча (1930 г.н.).
3. Найгрыш “*Пратасевіцкія страданні”.* Запісана ў вёсцы Забалацце Асіповіцкага раёна ад Санковіча Віктара Рыгоравіча (1930 г.н.).

## Фальклорны калектыў “Мілавіца”

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

### 1. Казакова Зоя

Казакова Зоя прыйшла ў фальклорны калектыў “Мілавіца” ва ўзросце 6 гадоў у 2013 годзе. Адразу ж паказала сябе адказнай, актыўнай, захопленай і дапытлівай асобай. Ветлівая, лідэр у калектыве. Актыўная ўдзельніца шматлікіх мерапрыемстваў, канцэртаў, традыцыйных святаў і абрадаў, а таксама майстар-класаў.



*Педагогі*: Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна (народная проза);
Кульбіцкая Вольга Аляксандраўна (народная песня);
Герашчанка Алеся Аляксандраўна (найгрыш).

### Праграма выступлення

1. Траецкая песня *“Ой, бяроза белая”.* Маладзечанскі раён, вёска Раёўшчына.
2. Сямейна-побытавая казка *“Як мужык гусей дзяліў”.*
3. Карагодна-танцавальная песня “*Ты цыганачка Ганна”.*

### 2. Юшкевіч Паліна

Юшкевіч Паліна пачала займацца ў калектыве “Мілавіца” з 2013 года. Акрамя спеваў і танцаў у “Мілавіцы”, займалася ў музычнай школе па класу “Флейты”. Бачыць сябе ў будучыні педагогам, дапамагае з малодшымі ўдзельнікамі калектыву.



*Педагогі*: Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна (народная проза);
Кульбіцкая Вольга Аляксандраўна (народная песня).

### Праграма выступлення

1. Вясельная песня *“Йказалі ў Дунаі вады многа”.* Вёска Грыцкавічы, Крупскі раён.
2. Сямейна-побытавая казка *“Лянівая жонка”.*
3. Найгрыш *“Таўкачыкі”.*

## III група

*(18–31 год)*

**Фальклорны тэатр "Скарбніца"**

*ДУА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт"*



**Новік Захар**

Займаўся ў школьным фальклорным калектыве, дзе і навучыўся іграць на гармоніку ад носьбіта Юхніка Яўгенія Васільевіча. Цікавіцца роднай мовай і традыцыйнай рэгіянальнай культурай, любіць спяваць народныя песні. Узнагароджаны шматлікімі дыпломамі рознага кшталту фестываляў і конкурсаў.

*Педагог* - Бярней Людміла Рыгораўна

**Праграма выступлення**

1. Казка *"У Ополі бы у Мотолі".* Вёска Ополь, запіс ад Казлоўскай Надзеі Антонаўны (1934 г.н.).
2. Песня вясельна-абрадавая *"Ходыв до дывчыны".* Вёска Лядавічы, запіс ад Шуляк Марыі Васільеўны (1951 г.н.).
3. *Мясцовыя найгрышы.* Запіс ад Юхніка Яўгенія Васільевіча (1970 г.н.), вёска Лядавічы.

**Фальклорны ансамбль "Млынок"**

*ДУА "Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Маяк" г. Мінска"*



**Мардань Дар'я**

Скончыла ДУА "Гімназія №17 г. Мінска" у 2010 годзе. За перыяд навучання ў гімназіі ўдзельнічала ў розных конкурсах і фестывалях установы адукацыі.

У 2015 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, прысвоена кваліфікацыя "Спецыяліст па фальклоры. Выкладчык". У 2015 годзе паступіла ў магістратуру вышэй названай установы на спецыяльнасць "мастацтвазнаўства" і ў 2016 годзе прысвоена кваліфікацыя "магістр мастацтвазнаўства". У 2019 паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва (тэорыя і гісторыя мастацтваў).

**Праграма выступлення**

1. *"Да мы Юр'я пачынаем".* Запісаны ў вёсцы Ахонава Дзятлаўскі р-н, Гарадзенская вобласць, запіс ад Надзеі Буряк.
2. Беларуская народная казка "*Музыка і воўк*".
3. Найгрыш на цымбалах *"Цярэжка"* (з мінорнай Лявоніхай). Вёска Івесь Віцебскай вобласці, запісана ад цымбаліста-віртуоза Васіля Радзюша.

## Фальклорны калектыў “Верасень”

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*

### Замарока Ксенія



Замарока Ксенія з’яўлецца ўдзельніцай фальклорнага калектыву “Верасень”. Прымае ўдзел у канцэртнай дзейнасці гурта. Навучаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на факультэце музычнага і харэаграфічнага мастацтва.

*Педагог* – Кандрашова Алена Вітальеўна

### Праграма выступлення

1. Летняя песня *“Ой у поле жыто жала”.* Запісана ў вёсцы Казлы Ельскага раёна Гомельскай вобласці.
2. Паданне *“Адкуль пайшлі буслы”*.
3. Найгрыш *“Дзева ў сенях стояла”.* Вёска Парэчча, Акцябрскі раён.

# V. Фальклорныя калектывы-госці

III адкрытага конкурсу беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

**Фальклорны тэатр “Скарбніца”**

*ДУА “Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт”*




Фальклорны тэатр “Скарбніца” быў створаны ў 2017 годзе Бярней Людмілай Рыгораўнай на базе народнай тэатральнай студыі “Слова”. З лютага 2019 года тэатр “Скарбніца” выдзелены ў самастойны калектыў, працягваючы фарміраваць як новых удзельнікаў, так і новыя пастаноўчыя работы.

Заснавальнік і кіраўнік тэатру “Скарбніца” - Бярней Людміла Рыгораўна - вядзе творчую работу па назапашванню аўтэнтычнага матэрыялу шляхам пераймання і запісу ад носьбітаў да моладзі і яго вывучэнню з удзельнікамі калектываў.

У праграме тэатра падрыхтаваны абрадавыя і пазаабрадавыя песні, танцы, прымаўкі, гульні, загадкі, найгрышы вяснова-летняга і зімняга цыклу на мясцовым дыялекце. Абрад “Стрілка”, абрад “Ваджэнне куста”, прадвясельныя абрады і святы “Сватанне”, “Выночкі”, “Каравай” і г.д.

Акрамя абрадаў у рэпертуары тэатра захоўваюцца літаратурныя творы студэнтаў і юных паэтаў. Так, на іх аснове створаны паэтычныя спектаклі “Мая Бацькаўшчына”, “Белая Вежа збірае сяброў”. На выпуск у праграме тэатра падрыхтаваны абрад “Ваджэнне куста” з гульнямі, песнямі і танцамі вясенняга цыкла.

Фальклорны тэатр з’яўляецца арганізатарам Адкрытага фестывалю фальклорнай творчасці “Палескія пераборы”, які праводзіцца на базе Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, дзе калектыў неаднаразова атрымліваў дыпломы. Гран-пры і дыпломы лаўрэатаў і дыпламантаў I ступені ў розных намінацыях (2019 г. - 2021 г.).

Фальклорны тэатр “Скарбніца” актыўна ўдзельнічае ў конкурсах і фестывалях рознага кшталту і мае шмат узнагарод:

Дыплом I ступені рэспубліканскага конкурсу “Арт-вакацыі” (2018 г., г.Мінск; 2020 г., Гран-пры і пяць дыпломаў I, II, III);

Дыплом ад нацыянальнага прадзюсера Таццяны Саўсніціс (Талін, Эстонія) за высокі прафесіянальны ўзровень пастаноўкі і арыгінальнае творчае ўвасабленне мастацкага вобраза (2018, г.Мінск);

Дыплом I ступені ў намінацыі фолк тэатр IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу “Скрыжаванні” (г.Мінск, 2018 г.);

Дыплом лаўрэата X рэспубліканскага фестывалю фальклорнай творчасці “Берагіня” (пасёлак Акцябрскі Гомельскай вобласці).

Дыплом Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА”, Сусветнай Федэрацыі клубаў, цэнтраў і Асацыяцыі ЮНЕСКА, Камітэта “Моладзь і клубы ЮНЕСКА”, Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА “За прасоўванне ідэй свету, развіццё праграмм у галіне адукацыі, навукі, культуры”. Інфармацыі і камунікацыі, а таксама асабісты ўклад у развіццё руху клубаў ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь.

*Кіраўнік* **-** Бярней Людміла Рыгораўна

**Праграма выступлення**

1. Вясельная песня *“Іваначка маладзенечкі”.* Запіс ад Алексяюк Вольгі Харытонаўны (1929 г. н.), горад Жабінка.
2. Пазаабрадавая песня *“Бадзёра”.* Запіс ад Шуляк Марыі Васільеўны (1951 г.н.), вёска Лядава, Іванаўскі раён.

**Фальклорны гурт “Скарбніца традыцый”**

*ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”*



Фальклорны гурт “Скарбніца традыцый” быў створаны ў 2020 годзе ў цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска пад кіраўніцтвам Хамутовай Ірыны Вітальеўны. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці аб’яднання з’яўляюцца засваенне і папулярызацыя абрадавага і пазаабрадавага фальклору. Удзельнікі спяваюць, танцуюць, распавядаюць народную прозу, гуляюць у традыцыйныя гульні, засвойваюць малыя жанры фальклору з захаваннем лакальных асаблівасцей мясцовасці фіксацыі ўзора.

Аб’дненне па інтарэсах складаецца з двух узроставых груп – малодшых школьнікаў і моладзі. Заняткі адбываюцца пад музычнае суправаджэнне акампаніятара Грышчанкі Антона Барысавіча. Навучэнцы імкнуцца засвоіць самастойна народныя музычныя інструменты, каб ствараць падчас танцавальных вечарын святочны настрой.

Рэпертуар падбяраецца з улікам узросту навучэнцаў, што спрыяе фарміраванню і раскрыццю творчых здольнасцей кожнай асобы. Вялікая ўвага надаецца развіццю здольнасці да імправізацыі з захаваннем стылістычных асаблівасцей.

Нягледзячы на адносна невялікі час існавання гурта, навучэнцы прымалі ўдзел у святах і абрадах у розных куточках нашай краіны. “Скарбніца традыцый” стала частым госцем у Беларускім дзяржаўным музее народнай архітэктуры і побыту “Строчыцы”.

*Кіраўнік* – Хамутова Ірыны Вітальеўны

**Праграма выступлення**

1.Загукальная песня *“Агу, вясна”.*
2.Веснавы танец-карагод *“Церніца”.*
3. Карагод *“Песеялі дзеўкі лён”;*
4. Гульня *“Явар”.*

*Сольнае выканальніцтва ўдзельніцы фальклорнага гурта*
*“Скарбніца традыцый”*

**Семчанка Вольга**

**Праграма выступлення**

1. Найгрыш да песні на акарыне.
2. Веснавая песня *“Із-пад гор-гары ручэй коціцца”.* Перанята ад Садковай Ж.П, вёска Дзямідавічы Касцюковіцкі раён, Магілеўская вобласці.
3. Казка *“Спевы воўка”.*

# VI. ПАЛАЖЭННЕ
## III адкрытага конкурсу беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”

### I. Агульныя палажэнні

1.1. Трэці адкрыты конкурс беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” праводзіцца ў красавіку 2023 г. у рамках Рэспубліканскай апорнай метадычнай пляцоўкі “Традыцыйная культура і моладзь”, Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце “Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў”.

1.2. Заснавальнікі і арганізатары конкурсу – упраўленне па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска, дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска”, грамадскае аб’яднанне “Беларускі фонд культуры”, раённае грамацкае аб’яднанне “Белая русь” г. Мінска.

1.3.Мэты і задачы конкурсу:

Трэці адкрыты конкурс народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” праводзіцца з мэтай мастацкага выхавання дашкольнай, школьнай, навучэнскай і працоўнай моладзі сродкамі традыцыйнай музычнай культуры Бацькаўшчыны.

Конкурс ставіць задачы:

- захавання і развіцця традыцыйнай музычнай культуры Беларусі;
- вывучэння, практычнага засваення і трансляцыі ўдзельнікамі конкурсу народных лакальных спеўных і музычных інструментальных традыцый розных рэгіёнаў краіны шляхам *вуснага пераймання;*
- выяўлення і падтрымкі музычна адораных дзяцей, падлеткаў, развіцця іх творчага патэнцыялу;
- абмену творчымі дасягненнямі і дэманстрацыі перанятых мастацкіх уменняў у сацыякультурным побыце.

### II. Кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу

2.1.Для ажыццяўлення кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей-аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў (са згоды іх кіраўнікоў) і зацікаўленых арганізацый, якія прымаюць удзел у правядзенні конкурсу.

Члены аргкамітэта ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на грамадскіх пачатках.

2.2. Аргкамітэт разглядае і зацвярджае:

праграму конкурсу;

спісы ўдзельнікаў;

склад рэжысёрска-пастановачнай групы;

склад экспертаў, які фарміруецца з ліку вядомых дзеячаў у галіне адукацыі, культуры і мастацтва;

склад сакратарыята;

святочную сімволіку, узоры ўзнагарод і іншую атрыбутыку, неабходную для правядзення конкурсу;

план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні конкурсу.

Вызначае формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі конкурсу;

2.3. Ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб’ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення, асвятлення конкурсу сродкамі масавай інфармацыі;

2.4. Вырашае іншыя арганізацыйныя пытанні.

## III. Удзельнікі конкурсу

3.1. У Трэцім адкрытым конкурсе беларускага народнага вакальна-інструментальнага выканальніцтва “Згукі мінуўшчыны” ўдзельнічаюць:

*спеўныя ансамблі* (далей – ансамблі),

*музычныя інструментальныя капэлы* (ансамблі традыцыйнага складу, далей – капэлы),

*салісты-інструменталісты*.

*салісты-мультывыканаўцы* твораў беларускай народнай спадчыны.

3.3. Удзельнікі конкурсу могуць уваходзіць у склад аматарскіх фальклорных ансамбляў, самадзейных калектываў народна-сцэнічнай творчасці ўстаноў адукацыі (агульнаадукацыныя школы, установы дадатковай адукацыі), культуры і мастацтваў (дзіцячыя музычныя школы, дзіцячыя школы мастацтваў), моладзевых навучэнскіх і працоўных творчых суполак Кастрычніцкага раёна г.Мінска і рэгіёнаў Беларусі.

3.4. Канкурсанты дэманструюць сваё майстэрства ў наступных *узроставых групах*:

**I група** – 4-6 год (выхаванцы дзіцячых садкоў);

**II група** – 7-11 год (навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў, дадатковай адукацыі, устаноў культуры);

**III група** – 12-17 год (навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў, дадатковай адукацыі, устаноў культуры);

**IV група** – 18-31 год (навучэнская і працоўная моладзь).

## IV. Структура і парадак правядзення конкурсу

Конкурс праводзіцца ў два туры.

4.1. <u>Першы тур</u> – ладзіцца ва ўстановах адукацыі, культуры і мастацтваў (у дашкольных, школьных, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, пачатковай і сярэдняй спецыяльнай музычнай адукацыі) – *студзень–сакавік 2023 г.*

4.2. <u>Другі тур</u> – праводзіцца **13 красавіка 2023 года.**

*<u>Інфармацыя аб часе і месцы правядзення адкрытага конкурсу "Згукі мінуўшчыны" будзе даслана пазней.</u>*

У другім туры прымаюць удзел пераможцы конкурсаў I тура: спеўныя ансамблі, інструментальныя капэлы, салісты-інструменталісты, салісты-мультывыканаўцы твораў народнай спадчыны.

У мерапрыемствах II тура конкурсу могуць прымаць удзел у якасці гасцей фальклорныя калектывы носьбітаў і пераемнікаў мясцовых мастацкіх традыцый (спеўныя, танцавальныя, народны тэатр і інш.), народныя музыкі.

## V. Праграма конкурсу

Канкурсанты ўдзельнічаюць у наступных праектах і намінацыях:

**5.1. Праект "Спеўнае выканальніцтва"**

***Намінацыі:***

*"Ансамблевыя спевы"* (дзяўчаты, 4–8 асоб);

"*Ансамблевыя спевы"* (хлопцы, не менш 3-х чал.);

*"Ансамблевыя спевы мяшаным складам"* (да 9 чал.).

Працягласць выступлення – <u>да 5 хвілін.</u>

Кожная намінацыя выступлення калектыву ацэньваецца асобна.

**5.2. Праект "Музычна-інструментальнае выканальніцтва"**

***Намінацыі:***

*"Ансамблевае выканальніцтва"* (да 7 асобаў; з выкарыстаннем дуды, скрыпкі, цымбал, трубы, кларнета, гармоніка ці акардэона, барабана ці бубна; магчыма – дудачкі, акарыны, жалейкі, і інш.).

Працягласць выступлення – <u>да 5 хвілін</u>

*"Траіста музыка"* (дуда, скрыпка, барабан ці бубен; могуць быць іншыя склады).

Працягласць выступлення – <u>да 5 хвілін</u>

<u>Узроставыя групы ўдзельнікаў у намінацыі</u> *"Ансамблевае выканальніцтва" "Траіста музыка":*

**I група** – навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў, дадатковай адукацыі, устаноў культуры (без уліку ўзроставай градацыі), з удзелам аднаго педагога.

**II група** – навучэнская і працоўная моладзь (18-31 год) без удзелу педагогаў.

"*Сольнае выканальніцтва"*

<u>Узроставыя групы:</u>

I група – 9-11 год (навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў, дадатковай адукацыі, устаноў культуры);

II група – 12-17 год (навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў);

III група – 18-31 год (навучэнская і працоўная моладзь).

Працягласць выступлення кожнага выканаўцы – <u>да 4 хвілін</u>

Кожнае выступленне ацэньваецца асобна. Музыкант можа не быць удзельнікам конкурснай капэлы.

**5.3. Праект “Турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў народнай спадчыны”**

<u>У турніры прымаюць удзел дзяўчаты і хлопцы ва ўзросце:</u>

*10–13 год* – І узроставая група;

*13–17 год* – ІІ узроставая група;

*18–30 год* – ІІІ узроставая група, якія не маюць спецыяльнай сярэдняй і вышэйшай музычнай адукацыі.

<u>Выступ складаецца з наступнай праграмы:</u>

*“Народная песня”*( І (10-13 год) і ІІ (13-17 год) групы выконваюць: абрадавую ці пазаабрадавую песню на выбар выканаўцы; ІІІ група (18-31) – песня абрадавая: вясна–лета ці вяселле–хрэсьбіны, адзін твор на выбар).

*“Народная проза”* (казка, легенда, паданне);

*“Найгрыш”* (з прыпеўкамі і скокамі). Выконваецца на любым беларускім народным музычным інструменце. Ухваляецца ігра на некалькіх іструментах.

Агульная працягласць выступлення кожнага саліста – **<u>да 7 хвілін</u>**;

Агульная ацэнка выступлення ўдзельніка складаецца з сумы балаў, атрыманых за кожны твор.

<u>Інструментальныя капэлы (удзельнікі конкурсу і госці) прымаюць удзел у суправаджэнні інтэрактыўных фальклорных танцавальных імпрэз, якія ладзяцца падчас перапынкаў паміж конкурсамі.</u>*13–17 год* – ІІ узроставая група;

*18–30 год* – ІІІ узроставая група, якія не маюць спецыяльнай сярэдняй і вышэйшай музычнай адукацыі.

<u>Выступ складаецца з наступнай праграмы:</u>

*“Народная песня”* ( І (10-13 год) і ІІ (13-17 год) групы выконваюць: абрадавую ці пазаабрадавую песню на выбар выканаўцы; ІІІ група (18-31) – песня абрадавая: вясна–лета ці вяселле–хрэсьбіны, адзін твор на выбар).

*“Народная проза”* (казка, легенда, паданне);

*“Найгрыш”* (з прыпеўкамі і скокамі). Выконваецца на любым беларускім народным музычным інструменце. Ухваляецца ігра на некалькіх іструментах.

Агульная працягласць выступлення кожнага саліста – **<u>да 7 хвілін</u>**;

Агульная ацэнка выступлення ўдзельніка складаецца з сумы балаў, атрыманых за кожны твор.

<u>Інструментальныя капэлы (удзельнікі конкурсу і госці) прымаюць удзел у суправаджэнні інтэрактыўных фальклорных танцавальных імпрэз, якія ладзяцца падчас перапынкаў паміж конкурсамі.</u>

## VI. Патрабаванні да рэпертуару

6.1. Конкурсныя праграмы складаюцца з твораў спеўнай і інструментальнай, апавядальнай мясцовай традыцыі.

6.2. Удзельнікі конкурсу спеўных ансамбляў і салістаў-мультывыканаўцаў старэйшых узроставых катэгорый фарміруюць свой рэпертуар з песень абрадаў каляндарнага (вясна, лета) і сямейна-родавага (вяселле, радзіны) цыклаў.

6.3. Музычныя інструментальныя капэлы і салісты-інструменталісты фарміруюць свае праграмы з песенных і танцавальных найгрышаў. Гэта можа быць: музыка народных танцаў: “Лявоніха”, “Крыжачок”, “Мяцеліца”, “Чобаты”, “Верабей”, “Каза”, “Заяц”, “Мікіта”, “Полька”, “Каханачка”, “Какетка”, “Кракавяк”, “Падэспань”, “Вальс”, кадрыля і інш.; найгрышы абрадавых і непрымеркаваных да абрадаў народных песень.

*Літаратура, якую можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы да конкурсу:*

- Традыцыйная мастацкая культура беларусаў у 6 тамах;
- Анталогія беларускай народнай песні
- Беларуская народная творчасць (Вяселле, Радзіны)

## VII. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў і арганізатараў конкурсу

7.1. Ацэнка выступлення спеўных ансамбляў, інструментальных капэл, салістаў-інструментальстаў і салістаў-мультывыканаўцаў ацэньвае эксперты (да 5 чалавек у кожным з напрамкаў) па закрытай ці адкрытай 10-бальнай шкале (пры неабходнасці выніковая адзнака выканаўцы абмяркоўваецца калектыўна) па наступных крытэрыях:

адпаведнасць рэпертуару ўзросту выканаўцаў;

валоданне стылем а’капэльных спеваў (зладжанасць гучання, адпаведнасць тэсітуры жанру песні);

тэхніка выканання на музычным інструменце;

валоданне прыёмамі імправізацыі;

мастацкая якасць казачнага ўзору, дасканаласць ведання яго сюжэту, захаванасць мясцовага дыялекту;

наяўнасць касцюмаў, якія выраблены і па-мастацку аздоблены ў мясцовай традыцыі.

7.2. Узнагароджванне ўдзельнікаў.

Дыпломамі *I, II, III ступені* і памятнымі сувенірамі ўзнагароджваюцца пераможцы ў кожным праекце, намінацыі і ўзроставай групе.

*Гран-Пры* конкурсу вызначаецца ў праекце “Турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў народнай спадчыны”. Уладальнік *Гран-Пры* ўзнагароджваецца спецыяльным дыпломам і каштоўным падарункам.

Канкурсанты, якія не сталі пераможцамі, узнагароджваюцца “Дыпломам удзельніка”.

Адпаведнымі дыпломамі і каштоўнымі падарункамі ўзнагароджваюцца гасцявыя калектывы.

Па рашэнні экспертаў могуць прысуджацца некалькі дыпломаў адпаведнай ступені, а таксама могуць быць разыграны не ўсе ўзнагароды.

У сольных намінацыях разыгрываюцца прызы глядацкіх сімпатый.

Кіраўнікі ансамбляў, капэл, салістаў, якія падрыхтавалі пераможцаў конкурсу, узнагароджваюцца адпаведнымі дыпломамі аргкамітэта.

Па рашэнні аргкамітэта адпаведнымі ўзнагародамі адзначаецца праца арганізатараў конкурсу. Рашэнне экспертаў канчатковае і перагляду не падлягае.

# Даведачная інфармацыя

| | |
|---|---|
| **Дырэкцыя конкурсу**<br>*220039, г. Мінск, вул. Чкалава, ¼,*<br>*e-mail:* oktcvr@minskedu.gov.by,<br>сайт: oktcvr.minsk.edu.by (ЦДАДіМ “Ветразь”),<br>tk.oktcvr.minsk.edu.by<br>(Рэспубліканская апорная метадычная пляцоўка<br>“Традыцыйная культура і моладзь”) | |
| 8 (017) 377 53 06 | Лабковіч Юлія Сяргееўна,<br>дырэктар Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска |
| **Службы конкурсу**<br>***Цэнтр каардынацыі:*** | |
| 8 (017) 375 19 64 | Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска |
| ***Арганізацыйная:*** | |
| 8 (017) 396 22 50 | Сізова Кацярына Чаславаўна,<br>намеснік дырэктара Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска<br>Грыцэнка Алена Іванаўна,<br>намеснік дырэктара Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска |
| 8 (017) 242 22 63 | Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна,<br>загадчык аддзяленнем народнай творчасці Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска |
| 8 (017) 375 51 44 | Захарэвіч Ала Паўлаўна,<br>загадчык аддзяленнем дыкаратыўна-прыкладной творчасці і выяўленчага мастацтва Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска |
| | ***Метадычны кабінет:*** |
| 8 (017) 360 03 35<br>mudo.metod@yandex.by | Лявончык Алена Мікалаеўна,<br>загадчык вучэбна-метадычным кабінетам Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска, метадысты |
| ***Тэлефоны спецвыклікаў:*** | |
| 101 | пажарная |
| 102 | міліцыя |
| 103 | хуткая дапамога |
| 112 | агульная дзяжурна-дыспетчарская служба |

# ЗМЕСТ


I. ПРЫВІТАННІ ЎДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ III АДКРЫТАГА БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ВАКАЛЬНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА "ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ" 4

II. ПРАГРАМА КОНКУРСУ 9

III. АРГАНІЗАТАРЫ, ТВОРЧЫЯ ГРУПЫ 10

Рада экспертаў 10

Арганізацыйны камітэт 11

Дырэкцыя 12

Рэжысёрска-пастановачная група 13

IV. УДЗЕЛЬНІКІ III АДКРЫТАГА КОНКУРСУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ВАКАЛЬНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА "ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ" 14

Праект "Спеўнае выканальніцтва" 14

Праект "Музычна-інструментальнае выканальніцтва" 21

Праект "Турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў народнай спадчыны" 25

V. ФАЛЬКЛОРНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ-ГОСЦІ КОНКУРСУ 32

VI. ПАЛАЖЭННЕ III АДКРЫТАГА КОНКУРСУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ВАКАЛЬНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА "ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ" 35

ДАВЕДАЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ 40

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Цэнтр дадатковай адукацыі**
**дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”**

**ДАВЕДНІК**

**“ЗГУКІ МІНУЎШЧЫНЫ”**
**III адкрыты конкурс беларускага народнага**
**вакальна-інструментальнага выканальніцтва**

***Аўтар ідэі і канцэпцыі праекта:***
Козенка Мікалай Аляксеевіч

***Адказны за выпуск:***
Грыцэнка Алена Іванаўна, намеснік дырэктара;

**Рэдакцыйны савет:**
Лабковіч Юлія Сяргееўна, *дырэктар*
Грыцэнка Алена Іванаўна, *намеснік дырэктара*
Лявончык Алена Мікалаеўна, *загадчык вучэбна-метадычным кабінетам*

**Над даведнікам працавалі:**

***Падрыхтоўка матэрыялаў:***
Касцяневіч Надзея Уладзіміраўна*, загадчык аддзялення народнай творчасці*
Лапурка Вікторыя Рамуальдаўна*, метадыст*

***Рэдактар:***
Лявончык Алена Мікалаеўна, *загадчык  вучэбна-метадычным кабінетам*
***Карэктар:***
Меньшыкава Марыя Уладзіміраўна, *метадыст*
***Вёрстка:***
Лапурка Вікторыя Рамуальдаўна*, метадыст*
***Вокладка і калажы:***
Храмцова-Басая Яніна Аляксандраўна, *метадыст*

**220039**
**г. Мінск,**
**вул. Чкалава, 1/4**
**Факс: 8 (017)  375 19 64**
**Эл. пошта цэнтра: oktcvr@minsk.edu.by**
**Сайт: oktcvr.minsk.edu.by**
**Вучэбна-метадычны кабінет**
**Тэлефон: 8 (017) 242-22-63**
**Эл.пошта: mudo.metod@yandex.by**
**Тэматычны сайт: tk.oktcvr.minsk.edu.by**